**Кітурка, І.** *Асветніцтва і аграрныя рэформы ў Вялікім Княстве Літоўскім у другой палове XVIII ст. /І. Кітурка // ARCHE: Мінск, 2011. – № 6. – С. 203–230.*

# АСВЕТНІЦТВА І АГРАРНЫЯ РЭФОРМЫ Ў ВКЛ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVIII СТ.

*Бедны селянін – бедная дзяржава.*
*Бедная дзяржава – бедны кароль.*

*Франсуа Кенэ*

У якасці эпіграфа да дадзенага артыкула ўзяты словы Франсуа Кенэ – заснавальніка так званай "школы фізіякратаў", ідэі якой у сярэдзіне – другой палове XVIII ст. набылі вялікую папулярнасць у Заходняй Еўропе. Дзякуючы сваёй медыцынскай адукацыі і таленту хірурга, акушэра і дантыста, Ф. Кенэ стаў асабістым лекарам французскага караля Людовіка XV, але найбольшую вядомасць ён набыў як аўтар працы "Эканамічная табліца". Яе ў 1758 г. уласнаручна надрукаваў на тыпаграфскім варштаце сам Людовік XV, выконваючы параду Ф. Кенэ пазбаўляцца ад лішняй вагі пры дапамозе фізічнай працы. Для характарыстыкі поглядаў Ф. Кенэ яго вучань і паслядоўнік Дзюпон дэ Нямур прапанаваў тэрмін "фізіякратыя" (літаральна – улада прыроды), тым самым падкрэсліўшы асноўныя прынцыпы тэорыі свайго настаўніка: ідэю дамінанты натуральнага права і зямлі як адзінай крыніцы грамадскага багацця. Абодва гэтыя пастулаты былі палемічна накіраваны супраць меркантылістаў, якія імкнуліся даказаць, што галоўнае багацце краіны крыецца ў актыўным гандлёвым балансе і ўмяшальніцтве дзяржавы ў эканоміку.

Насуперак тэорыі меркантылістаў Ф. Кенэ крыніцу багацця бачыў у здольнасці прыроды да вытворчасці. У "Эканамічнай табліцы" ён упершыню прадставіў рух таварных і грашовых патокаў у дзяржаве падобна кровазвароту ў чалавечым арганізме. Шырокавядомым стаў наступны тэзіс Ф. Кенэ: "Гасудар і народ ніколі не павінны забываць, што зямля ёсць адзіная крыніца багацця і што толькі адно земляробства памнажае апошнія"[1]. Згодна з вучэннем фізіякратаў, "чысты прадукт" або прыбавачная вартасць ствараецца толькі сельскагаспадарчай працай і знаходзіцца не ў сферы абарачэння, а ў сферы вытворчасці. Такім чынам, абсалютнае першынство фізіякратамі аддавалася сельскай гаспадарцы і шмат увагі ўдзялялася неабходнасці яе ўдасканалення, прынамсі, паляпшэнню земляробства, развіццю жывёлагадоўлі, фермерства, адмене ўсялякай рэгламентацыі гандлю і прамысловасці з боку дзяржавы. Натуральна, што ідэі прадстаўнікоў гэтай эканамічнай школы хутка набылі папулярнасць у еўрапейскіх краінах,

[1] Кенэ, Ф. Избранные экономические произведения / Ф. Кенэ. – М., 1960. – С. 133.

дзе пераважаў аграрны сектар эканомікі, у тым ліку і на тэрыторыі Рэчы Паспалітай.

Іх распаўсюджанню на землях Вялікага княства Літоўскага ў другой палове XVIII ст. садзейнічалі дзве асноўныя прычыны. Па-першае, завяршэнне да сярэдзіны XVIII ст. так званага "разбуральнага стагоддзя", выкліканага працяглымі войнамі (казацка-сялянскай вайной 1648–1651 гг., трынаццацігадовай вайной Расіі з Рэччу Паспалітай 1654–1667 гг., Паўночнай вайной 1700–1721 гг.). У той час, калі ў краінах Заходняй Еўропы адбываўся працэс першапачатковага накаплення капіталу, актыўна развівалася мануфактурная вытворчасць, а перадавыя дзяржавы ўжо стаялі на парозе прамысловага перавароту, у ВКЛ натуральны працэс эканамічнага развіцця быў штучна спынены ваеннымі разбурэннямі, гаспадарка ў дзяржаве не развівалася, а на працягу стагоддзя двойчы аказвалася перад неабходнасцю пасляваеннага аднаўлення.

Па-другое, працэс завяршэння адбудовы гаспадаркі супаў па часу з распаўсюджаннем на землях ВКЛ ідэалогіі Асветніцтва, якая прапагандавала культ адукаванасці і навукі. Ідэі гуманізму, натуральных правоў (права на жыццё, свабоду, уласнасць), дасягненні ў гуманітарных і прыродазнаўчых навуках прывялі да сапраўднай рэвізіі светаўспрымання найбольш адукаванай часткі грамадства ў розных галінах, у тым ліку і ў эканамічнай. Надзвычай папулярным стала палажэнне ідэалогіі Асветніцтва, якое даказвала, што палітычная бяспека краіны ў многім залежыць ад яе эканамічнага становішча, ад дабрабыту насельніцтва.

Важную ролю ў прапагандзе новых ідэй і рэалізацыі іх у жыццё адыграла пашырэнне і распаўсюджанне на ўсёй тэрыторыі Рэчы Паспалітай разнастайных выданняў эканамічнага характара[2]. Эканамічная літаратура не толькі давала новую інфармацыю аб перспектывах арганізацыі гаспадарчага жыцця. Змешчаныя там прыклады аб дасягненнях у еўрапейскіх кранах уплывалі на свядомасць людзей, на ўздым патрыятычных пачуццяў. Супрацьпастаўленне былой велічы Рэчы Паспалітай і існуючага становішча, прыклады эканамічнага росту Англіі і Францыі і абгрунтаванне прычын па якіх гэта адбывалася, прыводзілі да ўсведамлення неабходнасці рэфармавання гаспадарчай сістэмы ў сваёй дзяржаве, абапіраючыся на гістарычныя веды, еўрапейскі вопыт і рэаліі гаспадарчага і грамадскага жыцця[3].

Перавага ў краіне аграрнага сектара эканомікі перадвызначыла абавязковасць правядзення перабудовы ў сферы вытворчых адносін у першую чаргу менавіта па лініі ўласнік – земляроб. У сувязі з гэтым ідэі фізіякратаў набылі шырокую папулярнасць на землях Рэчы Паспалітай, у тым ліку і ў ВКЛ. Яскравай ілюстрацыяй прапаганды тэорыі фізіякратаў у

---

[2] Больш падрабязна пра эканамічную літаратуру другой паловы XVIII ст. гл.: Кітурка, І. Эканамічная літаратура другой паловы XVIII ст. аб неабходнасці і шляхах рэфармавання сельскай гаспадаркі Вялікага княства Літоўскага / І. Кітурка // Silva rerum nova: Штудыі ў гонар 70-годдзя Георгія Я. Галенчанкі. – Вільня–Мінск: AIDAI–ATHENAEUM, 2009. – С. 162–168.

[3] Z dziejów polskiej myśli filozoficznej i społecznej. – T. II: Wiek XVIII: Oświecenie. – Warszawa, 1956. – S. 12.

краіне могуць служыць наступныя цытаты, змешчаныя ў розных выданнях: "Нічога няма больш пераканаўчага за тое, што сельская гаспадарка з'яўляецца фундаментам палітычнага будаўніцтва любой краіны, і што народ, які жадае ўзняцца са слабасці і нястачы, найперш павінен прыкладаць сілы для паляпшэння і ўдасканалення сельскай гаспадаркі"[4], "калі сельская гаспадарка стане большай дасканалай, тады ў краіне хутка ўзнімецца грамадзянскі, ваенны і гандлёвы дух. Бо там, дзе квітнее сельская гаспадарка, квітнеюць навукі, рамёствы, патрыятызм і рэлігія"[5]; "земляробства з'яўляецца Маці ўсіх іншых рамёстваў"[6] і г.д.

Як слушна заўважыў беларускі даследчык Э.К. Дарашэвіч, адносіны да асветнікаў у ВКЛ у другой палове XVIII ст. былі рознымі, паколькі звязваліся, у першую чаргу, з палітычнымі інтарэсамі і асабістымі памкненнямі, таму нярэдка аўтарытэт віднага вучонага выкарыстоўваўся прадстаўнікамі розных палітычных груповак. Погляды Русо, напрыклад, былі блізкімі як барскім канфедэратам, так і тым, хто падтрымліваў Станіслава Аўгуста Панятоўскага, а ідэі фізіякратаў прыцягвалі і прыхільнікаў і праціўнікаў феадальных парадкаў[7].

На старонках эканамічных выданняў вялася актыўная прапаганда так званага новага земляробства. Гэтая сістэма гаспадарання ўпершыню з'явілася ў Галандыі і Англіі ў XVII ст., а ў пачатку XVIII ст. распаўсюдзілася на тэрыторыі амаль усёй Заходняй Еўропы. Галоўным прынцыпам новага земляробства з'яўлялася ліквідацыя сістэмы параў і пераход да добрага ўзворвання і ўгнойвання глебы: "Добрае гаспадарства базуецца на добрай апрацоўцы зямлі, глыбокім узворванні, пастаянным засяванні, замене аднаго гатунку збожжа іншым, на ўгнойванні грунтаў"[8]. Найбольш крытыкавалася распаўсюджаная ў той час у Рэчы Паспалітай сістэма трохполля, даказвалася яе эканамічная неэфектыўнасць. У прыватнасці адзачалася, што "звычай пакідання 1/3 часткі поля пад так званы "пар" паходзіць з даўніх часоў, калі цяглай і прадукцыйнай жывёлы было мала, таму не было магчымасці добра ўгнаіць і апрацаваць поле. У выніку трэцяя частка пакідалася, каб дзве другія можна было добра апрацаваць, а на трэццяй каб пасвілася жывёла"[9]. Але на паравым полі расліннасць была слабая і жывёла не магла там пракарміцца, і такім чынам магчымы ўраджай пры сістэме параў фактычна губляўся. "Не

---

[4] Pamiętnik Historyczno-Polityczno-Ekonomiczny. – Warszawa, 1789. – T. I. – S. 242.
[5] Pamiętnik Historyczno-Polityczno-Ekonomiczny. –Warszawa, 1787. – T. III. – S. 626.
[6] Roślin potrzebnych, pozytecznych, wygodnych, osobliwie Kraiowych, albo ktore w kraiu uzyteczne byc mogą, utrzymanie, rozmnozenie, i zażycie. – T. III: O rolnictwie, zbozach, łąkach, chmielnikach, winnicach, y roślinach gospodarskich: przez X.Krzysztofa Kluka, kanonika Kruswickiego, proboszcza Ciechanowieckiego. – Warszawa, 1779. – S. 4.
[7] Дорошевич, Э.К. Социально-политическая мысль Белоруссии эпохи Просвещения / Э.К. Дорошевич // Наш радавод. Материалы междунар. науч. конфер. по региональной истории Восточной Европы. – Гродно, 1991. – С. 325-326.
[8] Folwark w którym Grunta nie zostawują się nigdy ugorem. Przełożony na polski język przez X. Grzegorza Kniażewicza Matem. JW. JX. Biskupa Wilen. W Wilnie w Drukarni J. K. M. Rżpltey Akademickiej Societatis Jesu, 1770. – S. 48.
[9] Wybór ekonomicznych wiadomości z xiąg nayprzednieyszych zagranicznych. – T. 1. – Warszawa, 1770.– S. 13.

пару патрабуе зямля, а апрацоўкі і ўгнойвання"[10], – рабілася выснова ў эканамічных выданнях.

Для таго, каб паправіць сітуацыю ў сельскай гаспадарцы, прапаноўвалася ўвядзенне так званай норфалкскай сістэмы, пры якой поле падзялялася на 4 часткі і па чарзе засявалася наступным чынам: *азімыя – прапашныя культуры* (рэпа, бручка, буракі, бульба і інш.) – *яравое збожжа – канюшына*. Такая сістэма шматпольнага севазвароту патрабавала яшчэ і добрага арганічнага ўгнаення, якое, прынамсі, трэба было прымяняць з розумам, бо "нядобры перагной не тое што не паляпшае глебу, але толькі плодзіць рабакоў і ўсялякія хваробы зерню прыносіць"[11].

Натуральна, што ўдасканаленне земляробства ў значнай ступені залежала ад узроўню развіцця жывёлагадоўлі, якая забяспечвала сялян ежай, а іх працу – цяглавай сілай і арганічнымі ўгнаеннямі. Таму ў адпаведнасці з тэорыяй фізіякратаў, у эканамічнай літаратуры вялікая ўвага надавалася пытанням развядзення і гадавання коней, бо, як сцвярджалася, "коні – гэта душа земляробства"[12]. Рабіўся акцэнт на тое, што ўжыванне ў гаспадарцы коней больш эфектыўнае, чым валоў, паколькі коні мацнейшыя і здольныя да працы ўзімку[13]. Падрабязна апісвалася, як неабходна іх даглядаць, чым карміць, як не дапусціць розных конскіх хваробаў. Акрамя таго, яшчэ даваліся парады па догляду за каровамі, баранамі, свіньмі, хатняй птушкай[14].

У прапагандзе новай сістэмы гаспадарання важнае значэнне мела перакладзеная з англійскай мовы ксяндзом Рыгорам Князевічам і выдадзеная ў Вільні ў 1770 г. кніга "Фальварак, у якім землі ніколі не бываюць пад парам". У ёй асаблівая ўвага звярталася на тое, што для новага гаспадарання патрэбныя былі і новыя, больш дасканалыя прылады працы, у першую чаргу плугі на колах, якія б добра пераварочвалі зямлю – на 10 дзюймаў ушырыню і 8 дзюймаў углыб (1 дзюйм – 2,54 см). Пры гэтым Князевіч дазволіў сабе наступны каментар: "Плугі, якія выкарыстоўваюцца ў ВКЛ, толькі мардуюць жывёлу і селяніна, пакідаюць кавалкі некранутай зямлі, скібы зямлі не пераварочваюць, а толькі на бок завальваюць"[15]. У некаторых выданнях падаваліся дакладныя, пакрокавыя апісанні з малюнкамі, як зрабіць не толькі новыя плугі, а нават і сельскагаспадарчыя машыны, у першую чаргу сеялкі і жнейкі[16].

Такім чынам, новае земляробства прадугледжвала:

§ абавязковую ліквідацыю паравай сістэмы і ўвядзенне шматпольнага севазвароту;

§ вывядзенне новых парод жывёлы і павелічэнне яе колькасці;

---

[10] Тамсама.

[11] Kalendarz Rolniczy i Gospodarski przez P. Bradley napisany przez X. Grzegorza Kniaźewicza na polski język przełożony. – Wilno, 1770. – S. 3.

[12] Тамсама. – S. 78.

[13] Pamiętnik Historyczno-Polityczny-Ekonomiczny.– Warszawa, 1788. – T. I. – S. 32.

[14] Kalendarz ekonomiczny na rok 1779. – Warszawa, 1778.

[15] Folwark w którym Grunta nie zostawują się nigdy ugorem. – S. 8.

[16] Dzieło o rolnictwie. Przez P. Duhamel du Monceau, Towarzysza wielu Akademii y Towarzyszów Rolniczych Naywyższego we Francyi Sędziego Portowego. Po francuzki napisane. Na polski język przetłomaczone. – T. II. – Wilno, 1773.

§ спалучэнне збожжавага земляробства з вырошчваннем кармавых раслін і тэхнічных культур, неабходных для прамысловасці;

§ выкарыстанне новых сельскагаспадарчых прылад працы;

§ добрае ўгнойванне глебы.

А галоўнае, яго поспех быў гарантаваны толькі пры ўжыванні ўсіх гэтых прынцыпаў разам[17].

З выдання ў выданне даказвалася перавага новага спосабу гаспадарання, але разам з тым падкрэслівалася, што ён патрабуе дадатковых выдаткаў, паколькі калі эканамічныя затраты малыя, то і даход з добраў будзе невялікі, а ў канчатковым выніку і ўсё земляробства становіцца вельмі дарагім[18], а кошт на закупку насення ў іншых краінах "заўсёды будзе перакрыты і ўзнагароджаны добрым жнівом"[19]. Зразумела, што ўвядзенне новага земляробства наўпрост залежала ад жадання шляхты ўкладваць у гаспадарку свае дадатковыя сродкі. Таму праз эканамічныя выданні рабілася спроба паўплываць на шляхту і заахвоціць яе да вядзення гаспадарання па-новаму: "Паны нашыя, якія на загранічную мэблю – гэта значыць папросту на цацкі – кладуць столькі тысяч чырвоных злотых, аказалі б дзяржаве вялікую паслугу, калі б прывозілі насенне і жывёлу і пераймалі суседскі вопыт гаспадарання"[20].

Сярод іншых прапаноў па ўдасканаленню сельскай гаспадаркі на старонках эканамічных выданняў можна сустрэць наступныя: правядзенне меліярацыі, высаджванне садоў, развядзенне хатняй птушкі, выраб добрых малочных прадуктаў, у першую чаргу сыроў, і інш.

Калі неабходнасць увядзення ў арганізацыю сельскай гаспадаркі тэхналагічных і тэхнічных зменаў практычна не падлягала сумненню, то пад уплывам ідэй Асветніцтва ў ВКЛ, як і ва ўсёй Рэчы Паспалітай, вылучыліся два пытанні, вакол якіх разгарэлася найбольшая дыскусія – пытанне прадстаўлення сялянам асабістай свабоды і вызвалення іх ад паншчыны. У гэтай дыскусіі прымалі ўдзел шляхта і духавенства, натуральна, што самыя сяляне былі пазбаўлены права голаса. Прапанаваныя спосабы вырашэння гэтых важных для другой паловы XVIII ст. пытанняў выразна сведчылі пра складванне ў публіцыстыцы і грамадстве Рэчы Паспалітай двух асноўных накірункаў адносна рэфармавання сельскай гаспадаркі: кансерватыўнага і ліберальнага.

Прадстаўнікі кансерватыўнага накірунку былі прыхільнікамі захавання існуючай на той час сельскагаспадарчай сістэмы з наяўнасцю паншчыны і асабістай залежнасці сялян. Яны гаварылі пра неабходнасць фіксавання ў інвентарах дакладных нормаў павіннасцяў і падаткаў, бачылі нават мажлівасць памяншэння паншчыны, але пры гэтым выступалі супраць асабістай свабоды сялян, паколькі былі перакананы ў тым, што пры

[17] Folwark w którym Grunta nie zostawują się nigdy ugorem. – S. 48.
[18] Pamiętnik Historyczno-Polityczny-Ekonomiczny. – Warszawa, 1787. – T. III. – S. 790.
[19] Kalendarz Rolniczy i Gospodarczy. – S. 196.
[20] Wybor wiadomosci gospodarskich. – T. 1. – S. 120.

прадастаўленні сялянам свабоды тыя зробяцца гультаямі[21]. З іх пункту гледжання, задача селяніна заключалася толькі ў тым, каб даглядаць зямлю. "Селянін не мае права вучыцца больш ніякой справе, бо калі навучыцца, то пойдзе з зямлі, вёска будзе пустая, а зямля занядбаная"[22].

Сярод прыхільнікаў кансерватыўнай плыні пераважалі прадстаўнікі сярэдняй шляхты, якія пры вядзенні сваёй гаспадаркі найбольш былі зацікаўлены ў захаванні фальваркава-паншчыннай сістэмы[23]. Увядзенне новай сістэмы гаспадарання першапачаткова патрабавала ўкладвання значных сродкаў, якія маглі акупіцца толькі праз некаторы час. Шляхта ВКЛ, напэўна, не была гатова да інвеставання ў сельскую гаспадарку, якое было звязана яшчэ і з пэўнай рызыкай. Больш за тое, пэўная стабілізацыя сельскай гаспадаркі да сярэдзіны XVIII ст. спакушала шляхту на пошук спосабаў хуткага атрымання даходу, пераважна за кошт павелічэння падаткова-павіннаснага ціску падданых, а не на сумніўнае ўкладванне сродкаў (якіх, магчыма, і не было ў дастатковай колькасці) дзеля будучых ураджаяў і прыбыткаў.

Трыбунай кансерватараў па пытаннях сялянскай справы стаў часопіс "Манітор", які выходзіў у Варшаве ў 1765–1784 гг. і рэдактарам якога быў Францішак Багамолец. На старонках часопіса друкаваліся пераважна памяркоўныя артыкулы, у якіх абмяркоўвалася не неабходнасць ліквідацыі прыгонніцтва і паншчыны, а пераважна разважанні на тэму: што з'яўляецца для падданых уціскам, а што – не[24].

Ліберальны накірунак быў прадстаўлены больш шырокім колам выданняў, сярод якіх неабходна вылучыць наступныя: "Новыя эканамічныя і навуковыя веды альбо Часопіс усіх навук, неабходных для шчаслівага жыцця людзей"[25], "Выбар эканамічных звестак"[26], "Гістарычна-палітычны дзённік"[27], "Падборка гаспадарчых ведаў"[28], разнастайныя гаспадарчыя календары і інш.

Прыхільнікамі ліберальнага накірунку ў сялянскай справе былі найбольш вядомыя прадстаўнікі палітычнай эліты тагачаснай Рэчы Паспалітай, а таксама тыя магнаты, якім былі неабходныя грашовыя сродкі для будаўніцтва ў сваіх уладаннях мануфактур і людзей для працы на іх і для каланізацыі сваіх латыфундый. Правядзенне сацыяльна-эканамічных рэформаў магло даць ім і тое і другое[29].

---

[21] Próby reform włościańskich w Polsce XVIII wieku: Wybór źródeł / Opracował i wstępem zaopatrzył Stefan Inglot. – Wrocław: Wydawnictwo Zakładu Narodowego im. Ossolińskich, 1952. – S. XXXIII.
[22] Zasady o Rolnictwie, Rękodziełach i Handlu. Poprzedzaiące Proiekta Ekonomiczne stosowne do Konstytucyi Kommissyi Cywilno-Woyskowey. Pożyteczne dla Osob Kommissyinych iako i dła innych Właścicielów Dobr. – Suprasl, 1790. – №2 (старонкі не нумераваны).
[23] Próby reform włościańskich w Polsce XVIII wieku: Wybór źródeł. – S. XXX.
[24] Monitor. – 1765. – nr. XXVI. – S. 196–203; nr. LXV. – S. 496–503; 1766. – nr. XLV. – S. 338–345 і інш.
[25] Nowe wiadomosci ekonomiczne i uczone albo Magazyn wszystkich nauk do szczęśliwego życia ludzkiego potrzebnych. Wydane przez Wawrzynca Mitzlera de Kolof Filozofii i Medycyny Doktora, Historii Rzeczypospolitey Pisarza, różnych Akademii cudzozemskich Towarzysza J.K.M.K. – T. 1. – Warszawa, 1758.
[26] Wybór ekonomicznych wiadomości z xiąg nayprzednieyszych zagranicznych. – Warszawa, 1770.
[27] Pamiętnik Historyczno-Polityczno-Ekonomiczny. – Warszawa, 1782 – 1792.
[28] Wybór wiadomości gospodarskich. Przez X. Piotra Switkowskiego. – T. 1-2. – Warszawa, 1786.
[29] Próby reform włościańskich w Polsce XVIII wieku: Wybór źródeł. – S. XXXV.

Філасофія Асветніцтва ўвогуле змяніла погляд на працу і на працу ў сельскай гаспадарцы ў прыватнасці. Паступова прыходзіла ўсведамленне таго, што праца з'яўляецца крыніцай багацця, таму неабходна падвергнуць рэвізіі сістэму яе арганізацыі, каб чалавек працаваў не праз сілу, а з ахвотай і пільнасцю[30]. Такія, па сутнасці рэвалюцыйныя змены ў адносінах да фізічнай працы прывялі і да разумення неабходнасці сацыяльных пераменаў у грамадстве, галоўным з якіх было прадстаўленне свабоды сялянам, бо "цяжар вялікіх, часам нязносных прац так ганьбіць цела і разумовыя здольнасці беднага земляроба, што ён працуе без задавальнення, без ахвоты, поўны роспачы, апускаецца ва ўсім і ледзь памятае, што створаны вольным чалавекам і адрозніваецца ад працуючай штодзень побач жывёлы"[31], а "дасканаласць земляробства – справа людзей вольных, адукаваных, дасціпных, вынаходлівых, валодаючых маёмасцю і ўпэўненых у бяспецы сваіх сядзібаў"[32]. Больш за тое, у 1786 г. у "Гістарычна-палітычна-эканамічным дзённіку" сцвярджалася, што "культура Еўропы пачалася ў той час, калі людзі працоўнага класу былі вызвалены з кайданоў няволі, у якія іх закавала феадальная Канстытуцыя той часткі свету"[33].

Наданне сялянам эканамічнай свабоды ўваходзіла ў супярэчнасць з распаўсюджанай у той час сістэмай фальваркаў, дзе фальваркавае ворыва апрацоўвалася пераважна працай цяглых сялян. Для вырашэння гэтага пытання прапаноўваліся два асноўныя варыянты: альбо ліквідацыя фальваркаў і раздача грунтаў сялянам на чынш[34], альбо выкарыстанне наёмных работнікаў, паколькі ў параўнанні з паншчыннай працай "наёмныя людзі прынясуць для фальварку больш прыбытку"[35]. У любым выпадку, ачыншаванне сялян, якое б садзейнічала росту таварнасці сялянскай гаспадаркі, з'ўлялася неад'емнай часткай новага земляробства і яго мэтазгоднасць не ставілася пад сумненне. Але пры гэтым слушна заўважалася, што "не назва павіннасці дапаможа паляпшэнню становішча падданых, удасканаленню сельскай гаспадаркі, але сама сутнасць павіннасці. Не замена слова "паншчына" на слова "чынш" дапаможа сельскай гаспадарцы, а сапраўдная змена павіннасцяў"[36].

Такім чынам, у літаратуры наўпрост вызначалася сувязь і залежнасць паміж поспехам у рэфармаванні сельскай гаспадаркі і абавязковасцю сацыяльных пераўтварэнняў у грамадстве. Своеасаблівае падсумаванне такіх зменаў утрымлівалася ў IV томе "Гістарычна-палітычнага дзённіка" за 1784

[30] Historia kultury materialnej Polski w zarysie /Pod red. Zofii Kamieńskiej i Bohdana Baranowskiego. – T. IV: Od połowy XVII do końca XVIII wieku. – Wrocław: Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1978. – S. 33–34.
[31] Nowe wiadomości ekonomiczne i uczone. – S. 163.
[32] Folwark w którym Grunta nie zostawują się nigdy ugorem. – Przedmowa (не нумеравана).
[33] Pamiętnik Historyczno-Polityczno-Ekonomiczny. – T. I. – Warszawa, 1786. – S. 183.
[34] Przykład nowy bardzo łatwego a znacznego pomnożenia intraty z dobr dziedzicznych // Wybor wiadomości gospodarskich. – S. 162–173.
[35] Biblioteka Narodowa w Warszawie. Archiwum Czartoryskich, m/f 1643, s. 556 ("Uwagi nad gospodarstwem niektórych części Litwy").
[36] Zasady o Rolnictwie, Rękodziełach i Handlu. Poprzedzaiące Proiekta Ekonomiczne Stosowane do Konstytucyi Kommissyi Cywilno–Woyskowey. Pożyteczne dla Osob Kommissyinych iako i dla innych Właścicielów Dóbr. – Suprasl, 1790. – № 15.

г., дзе, у прыватнасці, адзначалася, што “ўдасканаленне сельскай гаспадаркі залежыць ад шасці абавязковых рэчаў: 1. асветы земляробаў; 2. упэўненасці іх ва ўласнай бяспецы і бяспецы сваёй маёмасці; 3. усталявання для іх справядлівасці; 4. абдумвання для іх спосабаў продажу лішкаў прадукцыі; 5. увядзення ў гарадах, мястэчках і вёсках уласнай прапінацыі; 6. вызначэння ўзнагароды для лепшых сялян-земляробаў”[37].

Што тычыцца першага пункта, то ў часопісе падкрэслівалася, што ўдасканаленню сельскай гаспадаркі павінна папярэднічаць асвета сялян, бо розум патрэбна ўзбагачаць ведамі пра неабходнасць, патрэбнасць і карыснасць той справы, якой чалавек займаецца, інакш “самыя светлыя прапановы будуць толькі біцца аб вушы і да розуму не дойдуць” [38]. Гэтае палажэнне невыпадкова было вынесена як асноўнае, паколькі традыцыяналізм у вядзенні сельскай гаспадаркі быў вельмі трывалы, а земляробства на той час было ахутана масай забабонаў, што не спрыяла яго эфектыўнасці.

Пад бяспекай сялян у часопісе разумелася неабходнасць грунтоўнага пераканання падданых у тым, што да іх асобаў “пан ніякага права не мае, акрамя таго, што калі б хацелі змяніць месца жыхарства, пан іх да таго часу не выпусціць, пакуль яны на сваё месца іншых не знойдуць”[39]. Пры гэтым, аўтары падкрэслівалі важнасць усведамлення сялянамі таго факту, што яны з’яўляюцца ўласнікамі сваёй маёмасці і паводле сваёй волі могуць ёю распараджацца. Зразумела, што ў словы “сялянская маёмасць” не ўкладваўся асноўны сродак вытворчасці – зямля. Але думка аб тым, што забеспячэнне пэўнасці ўласнасці з’яўляецца істотным фундаментам эканамічнага парадку ў краіне, падзялялася і аўтарамі іншых эканамічных выданняў[40].

Для забеспячэння чацвёртага пункта прапаноўвалася стварыць пры дварах спецыяльныя магазіны, у якіх падданыя маглі б збываць лішкі збожжа па коштах, якія ўсталяваліся на таргах[41].

Праблеме забароны па ўсіх гарадах і мястэчках яўрэйскай арэнды і неабходнасці ўвядзення дзяржаўнай прапінацыі быў прысвечаны шэраг артыкулаў у літратуры другой паловы XVIII ст. У прыватнасці адзначалася, што гэта “прынясе карысць і падданым, і дзяржаве”[42], і вопыт у самой Рэчы Паспалітай паказвае, што “кругом, дзе толькі шынкавыя напоі з двору выходзяць, сяляне багатыя і здаровыя”[43]. Насамрэч, гэта былі даволі сумніўныя палажэнні, але ў іх адлюстроўвалася агульная тэндэнцыя грамадскай думкі ў Рэчы Паспалітай, якая звязвала ў адно карчму, яўрэяў і п’янства насельніцтва. Гарэлка прызнавалася бадай што галоўнай шкодай для падданых, прычынай іх нястачы. П’яніца не можа быць добрым гаспадаром, сцвярджалася ў літаратуры, паколькі “гарэлка адбівае чалавеку розум,

---

[37] Pamiętnik Historyczno-Polityczny. – Warszawa, 1784. – T. IV. – S. 1141.
[38] Pamiętnik Historyczno-Polityczny. – Warszawa, 1784. – T. IV. – S. 1142.
[39] Тамсама. – S. 1145.
[40] Wybór wiadomości gospodarskich.– Warszawa, 1786. – T. II. – S. 443.
[41] Pamiętnik Historyczno-Polityczny.– Warszawa, 1784. – T. IV. – S. 1149.
[42] Тамсама. – S. 1150.
[43] Kalendarz Rolniczy i Gospodarczy na rok 1779. – S. 205.

здароўе, дабрадзейнасць, богабаязнь, руйнуе яго дом і гаспадарку... Дзе пануе гарэлка, там пануе вечная галеча”[44]; “Добры земляроб павінен быць моцным. П’янства аслабляе яго тэмперамент, асляпляе розум. Селянін павінен быць працавіты, а п’яніца губляе час на тое, каб праспацца. Селянін павінен укладваць грошы ва ўдасканаленне гаспадаркі, а п’яніца нясе іх у карчму. Селянін чакае лепшага часу для продажу сваіх тавараў, а п’яніца за бясцэнак іх марнуе”[45].

Для тых жа, хто добра працуе, не п’е, удасканальвае земляробства, неабходна прыдумаць ганаровыя адрозненні – адводзіць на вясковых сходах лепшае месца, нават старшынства, адзначаць каляровым адзеннем і інш.[46].

Такім чынам, літаратура другой паловы XVIII ст., безумоўна, абудзіла дыскусію пра неабходнасць рэфармавання сельскай гаспадаркі, але ажыццяўленне на практыцы прапанаваных мерапрыемстваў у ВКЛ аказалася дастаткова праблематычным. Заяўляючы пра сваю адданасць ідэям фізіякратаў, большасць прыватных уласнікаў і дзяржаўных дзеячоў аддавалі такім чынам даніну модзе, на самой справе застаючыся прыхільнікамі захавання ў непарушным стане існуючай фальваркава-паншчыннай сістэмы ці, як гэта адбылося ў дзяржаўных уладаннях ВКЛ, яе аднаўлення. Менавіта каралеўскія сталовыя эканоміі ВКЛ сталі тым аб’ектам пераўтварэнняў, дзе літаратурная дыскусія пра неабходнасць рэфармавання сельскай гаспадаркі стала дыскусіяй практычнай.

Сапраўды, аднымі з першых у так званую “станіславаўскую эпоху” рэформы пачаліся ў каралеўскіх сталовых эканоміях – найбуйнейшых дзяржаўных уладаннях ВКЛ. Па трапнаму выразу польскага даследчыка Вітольда Кулі, для Станіслава Аўгуста Панятоўскага, новага караля Польшы і вялікага князя Літоўскага, абранага на сейме 1764 г., павелічэнне даходаў каралеўскага скарбу было сапраўды пытаннем *“быць альбо не быць”*[47]. Разам з тым, прыбытковасць большасці крыніц каралеўскіх даходаў не залежала ад волі манарха, паколькі была фіксаванай і замацаванай канстытуцыйнымі нормамі. Да іх адносіліся паступленні з капальняў, мытняў, портаў, почты і інш. Па сутнасці, сталовыя эканоміі з’яўляліся адзіным магчымым і рэальным сродкам павелічэння прыбыткаў каралеўскага скарбу.

Важным крокам на гэтым шляху стала заснаванне, згодна з рашэннем канвакацыйнага сейму 1764 г., Эканамічнай Рады Літоўскага Скарбу або Скарбавай камісіі ВКЛ. У тэксце сеймавай канстытуцыі гаварылася аб тым, што галоўнай мэтай стварэння гэтага спецыяльнага дзяржаўнага органа было жаданне ўладаў “як найлепей назаўсёды арганізаваць парадак Літоўскага скарбу і памножыць яго даходы праз увядзенне лепшага кіравання і гаспадарання на карысць Рэчы Паспалітай”[48].

---

[44] Zabawy obywatelskie. Przez Piotra Switkowskiego. – № 1. – Warszawa, 1792. – S. 168-169.
[45] Folwark w ktorym Grunta nie zostawują się nigdy ugorem. – Przedmowa.
[46] Pamiętnik Historyczno-Polityczny.– Warszawa, 1784. – T. IV. – S. 1150.
[47] Kula, W. Szkice o manufakturach w Polsce XVIII wieku / W. Kula. – Warszawa: Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1956. – S. 310.
[48] Volumina legum. – Petersburg, 1860. – T. VII. – S. 75–78.

У склад Скарбавай камісіі, якую ўзначальваў вялікі падскарбі Літоўскі, уваходзілі яшчэ два чалавекі з Сенату і сем асобаў шляхецкага паходжання, якіх выбіралі на сейме. У абавязак Эканамічнай Радзе Літоўскага скарбу ставілася вырашэнне большасці асноўных гаспадарчых пытанняў: кантроль за фінансамі, размеркаванне і збор падаткаў, ажыццяўленне судовых функцый па фінансавых справах, прызначэнне скарбавых афіцыялістаў і зняцце з пасады тых, хто дрэнна выконваў свае абавязкі, нагляд за гандлем і ўвогуле за эканамічным становішчам у краіне. Месцам пасяджэнняў Скарбавай камісіі ВКЛ быў прызначаны Гарадзенскі каралеўскі палац, дзе таксама размяшчаўся скарбавы архіў.

Паколькі ўся праца камісараў Скарбавай камісіі павінна была садзейнічаць павелічэнню прыбыткаў дзяржаўнага скарбу, то ў абавязак ім таксама ставіўся разгляд прапановаў па рэфармаванню дзяржаўных уладанняў. Фактычна, улады запрашалі да дыскусіі ўсіх, хто меў якія-небудзь меркаванні наконт магчымасці паляпшэння вядзення гаспадаркі.

Праца Эканамічнай Рады Літоўскага Скарбу пачалася 1 студзеня 1765 г., а ўжо 5 сакавіка 1765 г. у яе трапіў адзін з першых праектаў, які тычыўся менавіта аграрных пераўтварэнняў у Берасцейскай і Кобрынскай каралеўскіх эканоміях. Аўтарам згаданага праекту быў каморнік Віленскага ваяводства Людвік Кройц (Ludwik Kreutz).

Шмат якія факты біяграфіі гэтага чалавека і сёння застаюцца невядомымі. З упэўненасцю можна сказаць толькі тое, што Л.Кройц, будучы шэраговым каморнікам, стаў прыметнай асобай у Вялікім Княстве ў 1765 г., менавіта пасля прадстаўлення свайго праекту аб рэфармаванні эканомій.

Гэты праект, матэрыялы якога былі выяўлены намі ў Галоўным архіве старажытных актаў у Варшаве, адразу зацікавіў Скарбавую камісію, паколькі ў ім прапаноўвалася “без усялякага абцяжарвання падданых” амаль у два з паловай разы павялічыць даход з Берасцейскай і Кобрынскай эканомій (з 135000 тынфаў да 324383 тынфаў). Па словах самага Кройца, “фундаментам гэтага праекту з’яўлялася адмена павіннасцей, якія абцяжарваюць падданых, а замест таго – павелічэнне агульнага чыншу”[49]. Сваю прапанову Кройц абгрунтаваў тым, што ў Берасцейскай і Кобрынскай эканоміях “падданства вельмі размножылася, а недахоп грунтаў часта прымушае сялянаў зыходзіць у земскія добры”. Таму, згодна з праектам, прапаноўвалася неадкладна ліквідаваць усе фальваркі і раздаць зямлю сялянам на чынш. З першых радкоў свайго праекта Кройц хацеў пераканаць караля, што ў выніку правядзення гэтага мерапрыемства каралеўскі скарб “ніколі не будзе цярпець стратаў”[50].

Віленскі каморнік палічыў сваім абавязкам даказаць, што прапанаванае ім увядзенне толькі грашовых выплатаў не з’яўляецца надзвычай цяжкім для падданых. Для гэтага ён падлічыў усе падаткі і павіннасці, якія выконвалі сяляне згодна з апошнім інвентаром 1742 г., уключаючы паншчыну (па 15

[49] Archiwum Główny Akt Dawnych w Warszawie (AGAD), Archiwum Kameralne, III/26, a. 237.
[50] Тамсама.

грошаў за дзень), і ў выніку аказалася, што сума іх у 2 разы большая (50 тынфаў), чым прапаноўваў увесці Кройц (25–30 тынфаў), а рэальныя даходы эканомій – меншыя. Таму ён зрабіў выснову, што скасаванне паншчыны будзе найбольш мэтазгодным як з пункту гледжання эфектыўнасці гаспадарання, так і адносінаў падданых да гэтага мерапрыемства.

Трэба адзначыць, што вакол праекта Кройца адразу разгарнулася сапраўдная інтрыга. У дыскусію ўступіў апошні арандатар гэтых эканомій граф Ежы Флемінг. Ён не толькі адчуў сябе абражаным словамі аўтара праекту, што “такога прыбытку пан граф Флемінг ніякімі спосабамі пры найлепшым гаспадарстве даць на зможа, а таму ад кантракту трэба адмовіцца”, але і не беспадстаўна палічыў іх небяспечнымі для сябе.

На працягу 23 год (з 1742 г. па 1765 г.) Ежы Флемінг быў нязменным арандатарам Берасцейскай і Кобрынскай эканомій. Па ўмовах кантракту ён быў абавязаны ўносіць пэўныя грашовыя выплаты ў скарб, перыядычна праводзіць рэвізію ўладанняў і “імкнуцца дапамагчы як мага большай колькасці падданых, здольных да гаспадарства, не чакаючы за гэта ніякай узнагароды”. Набор такіх стандартных выразаў утрымліваўся ў той час амаль у кожным кантракце на арэнду. Але на самой справе арандатары, і граф Флемінг у іх ліку, у першую чаргу бачылі ў арэндзе крыніцу папаўнення ўласнага багацця.

Часовыя трымаўцы звычайна не клапаціліся аб захаванасці і перспектывах гаспадарчага развіцця атрыманых уладанняў, прычым ім не забаранялася перадаваць маёнткі ў субарэнду іншым асобам. Імкнучыся павялічыць свае прыбыткі, арандатары часта парушалі “ўставы” эканомій, павялічвалі сялянскія падаткі і павіннасці, аднак дакументальна гэта не фіксавалася.

Так, за 23 гады інвентар Берасцейскай і Кобрынскай эканомій складаўся толькі адзін раз – у 1742 г. пры заключэнні першага кантракта на арэнду, але відавочна, што гаспадарчы стан эканомій да 1765 г. змяніўся. Таму граф Флемінг не быў зацікаўлены ў падтрымцы ўладамі праекта Л.Кройца. Ужо 14 сакавіка 1765 г. ён звярнуўся ў Скарбавую камісію з заявай, у якой спрабаваў пераканаць камісараў і караля ў тым, што рэалізацыя праекта віленскага каморніка наогул немагчымая.

У адрозненне ад Кройца, які прадставіў усё ў падлічаным выглядзе (колькасць зямлі, памер падаткаў і агульную суму даходу), Флемінг не прывёў фактычна ніводнага слушнага доваду супраць, а абмежаваўся толькі агульнымі заўвагамі, што ў эканоміях шмат пустога грунту, “а калі рабацізну скасаваць, то і той, які ўжываюць фальваркі, застанецца пустым”[51]. Яшчэ граф Флемінг выказаў сваё перажыванне за сялян, з нагоды таго, што яны вельмі “ўбогія” і не здолеюць выплочваць чынш.

Гэтыя заўвагі Людвік Кройц не мог пакінуць без адказу. 21 сакавіка ён прадставіў Скарбавай камісіі яшчэ адзін дакумент, у якім не столькі імкнуўся абараніць свой праект, колькі хацеў паказаць некампетэнтнасць і

[51] AGAD, Archiwum Kameralne, III/27, a. 127.

недасведчанасць у справах эканомій іх былога арандатара. Кройц іранічна заўважаў, што Флемінг прывёў дадзеныя як мінімум 20-гадовай даўнасці, з інвентара 1742 г., але з таго часу становішча ў эканоміях значна змянілася. Пры гэтым Кройц падкрэсліў, што сяляне "***за вольнасць*** (выдзелена намі – І.К.) і больш заплацяць"[52]. У дадзеным выпадку пад вольнасцю Кройц разумеў свабоду ад паншчыны.

Гэты адказ Флемінгу з'яўляецца важным дакументам, паколькі больш дакладна тлумачыць некаторыя працэдурныя моманты прапанаваных пераўтварэнняў, якія адсутнічаюць у першапачатковым праекце. Так, аўтар падкрэсліў, што чынш павінен быць прызначаны дыферэнцыравана, у залежнасці ад якасці зямлі: "У некаторых вёсках чынш па прычыне подласці грунтаў павінен быць паменшаны, у іншых, бяручы пад увагу добрасць грунтаў, чынш павінен быць павялічаны. І нідзе без слушнай рацыі падвышэнне або памяншэнне рабіць не будзем"[53].

Пры гэтым Кройц прапаноўваў спачатку правесці апрабацыю свайго праекта. Ён лічыў мэтазгодным прызначыць Генеральную камісію на 1 чэрвеня 1765 г. і па яго разліках ужо да Святога Яна (24 чэрвеня) была б вядома рэзалюцыя – "або праект, або даўнім звычаем кіраваць павінны"[54]. Паказальна, што напрыканцы дакумента віленскі каморнік, аддаючы даніну традыцыі, падкрэсліў, што сваім праектам ён нічога новага не прыдумляе, бо гэтыя мерапрыемствы ў эканоміях ужо практыкаваліся. У дадзеным выпадку Кройц звяртаўся да мэтанакіраванай палітыкі дзяржавы па пераводу сялянаў сталовых эканомій з адпрацовачнай рэнты на грашовую ў другой палове XVII ст.[55]. Яна ў многім выратавала эканоміку дзяржавы ад канчатковага заняпаду падчас "патопу" і спрыяла аднаўленню гаспадаркі падданых. Але, калі ў сярэдзіне XVII ст. ачыншаванне ўспрымалася як вымушаная мера, то Кройц быў перакананы ў яе гаспадарчай эфектыўнасці.

Такая рэфарматарская ініцыятыва не магла не звярнуць на сябе ўвагу ўлады. Ужо ў красавіку 1765 г. Людвік Кройц "за практычныя здольнасці" быў прызначаны Генеральным мернічым у сталовых добрах Вялікага княства Літоўскага[56]. А хуткасць, з якой развіваліся падзеі, і шчырая зацікаўленасць дзяржаўнай улады ў прадстаўленых прапановах падштурхнулі яго ўнесці ў маі 1765 г. на разгляд Скарбавай камісіі другі праект, які на гэты раз тычыўся новаўвядзенняў у гарадах Берасцейскай і Кобрынскай эканомій.

З пункту гледжання Людвіка Кройца, неабходна было пабудаваць у Берасці замкавы бровар і цагельню, а ў Кобрынскай эканоміі для ажыўлення гандлю заснаваць горад Станіславаў Каралеўскі з ярмаркамі, таргамі,

---

[52] AGAD, Archiwum Kameralne, III/27, a. 133.
[53] Тамсама, a. 134.
[54] Тамсама, a. 135.
[55] Гл.: Kościałkowski, St. Ze studjów nad dzejami ekonomji królewskich na Litwie / St. Kościałkowski //Rocznik Towarzystwa Przyjacół Nauk w Wilnie. – Wilno, 1914. – S. 72–168; Похилевич, Д.Л. Перевод государственных крестьян Великого княжества Литовского с отработочной ренты на денежную в XVII в. /Д.Л. Похилевич //Исторические записки. – Т. 37. – Москва, 1951. – С. 144–168; Кітурка, І.Ф. Дзяржаўныя ўладанні на землях Беларусі ў другой палове XVII–XVIII ст.: палітыка гаспадарчага аднаўлення і развіцця /І.Ф.Кітурка. – Гродна: ГрДУ, 2003. – С. 31–68.
[56] AGAD, Archiwum Kameralne, III/27, a. 217.

крамамі, гасцінцамі. Аднак пры гэтым ён чарговы раз падкрэсліў, што “толькі ўвядзенне новай эканомікі пры раздачы фальваркавых грунтаў на чынш можа прывесці да парадку ў эканоміях”[57]. У выніку рэалізацыі сваіх праектаў генеральны мернічы ў сталовых добрах ВКЛ абяцаў павялічыць каралеўскі скарб амаль на 400 000 тынфаў. Гэта было вельмі прывабна, але сваё важкае слова павінен быў сказаць чалавек, які спецыяльным каралеўскім распараджэннем ад 8 сакавіка 1765 г. быў прызначаны генеральным адміністратарам усіх сталовых эканомій у ВКЛ, – Антоній Тызенгаўз.

Як сведчаць дакументы Скарбавай камісіі, А. Тызенгаўз ужо 16 сакавіка 1765 г. быў азнаёмлены з праектам Л. Кройца. Ён з цікавасцю сачыў за пісьмовай дыскусіяй паміж віленскім каморнікам і графам Флемінгам, аднак яго афіцыйнае рэзюмэ на гэты конт застаецца невядомым. Пры гэтым, з ускосных фактаў, у прыватнасці, з пісьма А. Тызенгаўза да караля ад 15 мая 1765 г., становяцца зразумелыя яго агульныя адносіны да асноўнай ідэі Кройца – ачыншавання падданых: “Разбураць фальваркі і чыншаваць хлопаў – я ніколі не прытрымліваўся такога меркавання, асабліва ў Берасцейскай, Кобрынскай і Оліцкай эканоміях... А паколькі гэты праект паказвае толькі даход у гатовых грошах і не паказвае цяжкасцяў гаспадарання, то, беручы пад увагу стан краю і сялян, такі падыход лічу небяспечным”[58]. Хутчэй за ўсё, меркаванне генеральнага адміністратара, які з’яўляўся сябрам Станіслава Аўгуста, мела рашаючае значэнне. Больш за тое, пасля прызначэння яго 6 чэрвеня 1765 г. на пасаду надворнага падскарбія ВКЛ, кароль уручыў А. Тызенгаўзу ключы ад каралеўскай скарбніцы і фактычна надзяліў яго неабмежаванымі паўнамоцтвамі ў каралеўскіх эканоміях. Лёс праекта, прапанаванага Людвікам Кройцам, быў прадвызначаны.

Неабходна падкрэсліць, што генеральны мернічы яшчэ на працягу ўсяго 1766 г. змагаўся за неабходнасць ажыццявіць прапанаваныя ім мерапрыемствы, удакладняў і дэталізаваў свае праекты, даказваў іх эканамічную выгаду, скардзіўся, што не ведае да каго звярнуцца са сваім праектам, паколькі яго “адзін да другога пасылаюць і ніхто не мае часу, каб выслухаць”[59]. Такіх дакументаў на імя караля было шмат, што дазволіла Кройцу ў адным з іх падпісацца наступнымі словамі: “Найяснейшага Караля Пана Майго Міласцівага Верны Падданы і без подпісу знаёмы”[60].

Апошні вядомы мемарыял Людвіка Кройца пад назвай “Данясенне пра стан Шавельскай эканоміі”[61], быў прадстаўлены на разгляд Скарбавай камісіі ў 1769 г. У ім утрымліваліся некаторыя практычныя парады з мэтай павелічэння даходаў з гэтага ўладання. У 1772 г. Кройц склаў дакладную карту Шавельскай эканоміі, на якой рознымі колерамі вызначыў межы гарадскіх і шляхецкіх грунтаў, а таксама ключоў у гэтым уладанні. Хутчэй за ўсё, зразумеўшы бяссэнсавасць сваіх памкненняў на глебе рэфармавання

[57] AGAD, Archiwum Tyzenhauzów, D-1/XIV, а. 244.
[58] AGAD, Archiwum Kameralne, III/28, а. 88.
[59] AGAD, Zbiór Popielów, № 310, а. 200.
[60] Тамсама, а. 176 адв.
[61] AGAD, Archiwum Kameralne, III/276, а. 31–43.

эканомій, Кройц засяродзіўся на сваёй галоўнай справе – перамеры зямлі і картаграфіі. Вядома, што ў 1773 г. Людвік Кройц ужо не жыў[62].

А ў эканоміях з 1765 г. ажыццяўлялася іншая рэформа, ініцыятарам якой быў Антоній Тызенгаўз. У другой палове XVIII ст. у Еўропе рэзка ўзняўся попыт на збожжа, і генеральны адміністратар меў на мэце павелічэнне прыбыткаў каралеўскага скарбу шляхам паўсюднага ўвядзення ў эканоміях фальваркаў у якасці сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, асноўнай мэтай дзейнасці якіх станавіўся таварны характар вытворчасці збожжа. У сталовых эканоміях быў праведзены цэлы шэраг гаспадарчых мерапрыемстваў: перамер зямлі, рэарганізацыя і ўпарадкаванне сялянскага землекарыстання, уведзена новая сістэма падаткаабкладання, згодна з якой сяляне з роўнага для ўсіх асноўнага надзелу ў 1/4 частку валокі (5,34 га) абавязаны былі адпрацаваць 2 дні паншчыны ў тыдзень на фальваркавым ворыве. Па сутнасці гэта азначала чатырохразовае павелічэнне павіннасцяў у параўнанні з валочнай памерай сярэдзіны XVI ст., якая вызначыла памер паншчыны ў 2 дні ў тыдзень з валокі зямлі (21,36 га). У дадатак была павышана і колькасць дзён шарваркаў, гвалтаў, талокаў.

Разам з тым, А. Тызенгаўз заяўляў пра сваю прыхільнасць ідэям фізіякратаў, прапагандаваў увядзенне новага земляробства, абявязваў сялянаў высажваць пладовыя дрэвы, загадаў заснаваць на вёсках “камунальныя магазіны” – спецыяльныя збожжавыя склады, прызначаныя для сялян на выпадак агульнага неўраджаю ці стыхійнага бедства, а таксама “камунальныя касы”, грошы з якіх павінны былі ісці на добраўпарадкаванне вёсак, утрыманне доктара, вясковага радзільнага дома, настаўніка для сялянскіх дзяцей і інш.[63].

Як бачна, яго план кардынальным чынам адрозніваўся ад праектаў Л. Кройца і быў заснаваны на поўнасцю супрацьлеглых прынцыпах – аднаўленні фальваркаў і паншчыны, хаця і з паляпшэннем апрацоўкі зямлі і выкарыстаннем тагачаснай заходнееўрапейскай тэхнікі. На першых парах даходы з эканомій ВКЛ сапраўды выраслі. Аднак, калі Кройц прапанаваў павялічыць прыбытак каралеўскага скарбу з Берасцейскай і Кобрынскай эканомій у 2,5 разы “без усялякага абцяжарвання падданых”, то Антоній Тызенгаўз дабіўся такога выніку ў першую чаргу дзякуючы ўзмацненню павіннаснага ўціску. Правядзенне менавіта такіх аграрных пераўтварэнняў у каралеўскіх сталовых эканоміях ВКЛ Вітольд Куля абгрунтаваў тым, што ў аснове рэфарматарскай дзейнасці А. Тызенгаўза ўсёж-такі ляжаў “вялікі мануфактурны план”[64] – стварэнне ў эканоміях мануфактур, заснаваных на дармавой працы дзяржаўных сялян. Хутчэй за ўсё, надворны падскарбі ВКЛ быў прыхільнікам так званага кансерватыўнага накірунку і напісаныя ім каралю словы пра тое, што ён супраць разбурэння фальваркаў і

---

[62] Kościałkowski, St. Antoni Tyzenhauz. Podskarbi Nadworny Litewski / St. Kościałkowski. – London, 1970. – T. I. – S. 606.

[63] Голубеў, В., Кітурка, І. Аграрная рэформа Антонія Тызенгаўза / В. Голубеў, І. Кітурка // Гісторыя Беларусі: У 6 т. – Т. 3. Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII стст.). – Мн.: Экаперспектыва, 2004. – С. 178–187.

[64] Kula, W. Szkice o manufakturach w Polsce XVIII wieku. – S. 424.

ачыншывання сялян, былі звязаны не канкрэтна з праектам Людвіка Кройца, а выражалі яго асабісты погляд на рашэнне сялянскай праблемы. Тым больш, што невядома, каб Антоній Тызенгаўз праводзіў нейкія радыкальныя мерапрыемствы ў сваіх дзедзічных уладаннях у Паставах.

Натуральна, што павялічэнне падаткава-павіннаснага абкладання выклікала моцны пратэст сялянства ва ўсіх яго праяўленнях – ад напісання скаргаў і адмоваў хадзіць на паншчыну да масавых уцёкаў і ўзброенага супраціўлення, якое адбылося ў 1769 г. у Шавельскай эканоміі. Пра гэтае паўстанне Людвік Кройц у сваім “Мемарыяле” зафіксаваў наступнае: “Відавочна, што [сяляне] самі сабе хочуць усталёўваць права праз арганізацыю бунтаў, але, напэўна, гэта даказвае на цяперашні час, што ў Рэчы Паспалітай, як у Англіі, будзе фарміравацца трэці стан”[65].

Сталася так, што ў другой палове XVIII ст. прагрэсіўныя эканамічныя пераўтварэнні праводзілі ў сваіх маёнтках прыватныя ўласнікі і царкоўныя дзеячы. Як правіла, гэта былі людзі, якія атрымалі выдатную адукацыю ва ўласнай краіне і за мяжою, успрынялі перадавыя ідэі Асветніцтва і былі прыхільнікамі не толькі паляпшэння становішча сялян, як асноўнай вытворчай сілы тагачаснага грамадства, але і правядзення іншых радыкальных дзяржаўных рэформ, у першую чаргу палітычных.

Найбольш вядомымі з’яўляюцца гаспадарчыя мерапрыемствы ў маёнтках Шчорсы Навагрудскага павета, які належаў падканцлеру ВКЛ Іахіму Храптовічу[66], і Паўлава (Мерач) Віленскага ваяводства, што знаходзіўся ва ўладанні вялікага пісара ВКЛ, ксёндза Паула Ксаверыя Бжастоўскага[67].

Маёнтак Шчорсы разам з шэрагам іншых уладанняў у розных паветах ВКЛ Іахім Храптовіч атрымаў у спадчыну ў 1766 г. пасля смерці бацькі і фактычна адразу прыступіў да гаспадарчых пераўтварэнняў. Як вынікае з інфармацыі, прадстаўленай у 1783 г. у “Гістарычны і палітычны дзённік” Каралем Адольфам де Мехлігам, капітанам корпусу пантанераў, свае рэформы Храптовіч пачаў, наняўшы двух геаметраў, з перамеру ўсёй зямлі і маёмасці. Усе сяляне ва ўладанні былі абвешчаны вольнымі людзьмі, была ліквідавана паншчына, а асноўным падаткам стаў чынш, які складаў трэцюю частку ўраджаю і выбіраўся наступным спосабам: калі з трох моргаў грунтаў (адзін засеяны азімымі, другі – яравымі, а трэці – пад парам) будзе сабраны ўраджай на агульную суму ў 90 злотых, то з іх 60 злотых – гэта выдаткі на насенне, працу, утрыманне сялянскай гаспадаркі, а чысты даход толькі 30 злотых, з якіх толькі трэцяя частка – 10 злотых – складаюць памер чыншу[68].

---

[65] AGAD, Archiwum Kameralne, III/276, a. 38.
[66] Opisanie wybornego gospodarstwa w dobrach Szczorse do JW. Chreptowicza Podkanclerzego Litt: należących w Woiewodztwie Nowogrodskim leżących // Pamiętnik Historyczny i Polityczny. – T. I. – Warszawa, 1783. – S. 529–540.
[67] Rostworowski, Z. Reforma pawłowska Pawła Ksawerego Brzostowskiego (1767–1795) /Z. Rostworowski //Przegląd historyczny. – 1953. – № 1–2; Bartyś, J. Rzeczpospolita Pawłowska na tle reform włościańskich w Polsce w XVIII wieku / J. Bartyś. – Warszawa, 1982.
[68] Opisanie wybornego gospodarstwa w dobrach Szczorse do JW. Chreptowicza Podkanclerzego Litt: należących w Woiewodztwie Nowogrodskim leżących. – S. 532.

Пры гэтым сялянам давалася права выбару – або заплаціць рэнту грашыма, або збожжам паводле коштаў, якія на той час усталююцца на рынку ў Наваградку.

За карыстанне дрэвам для палення сяляне ўладання павінны былі або высячы 1-2 сажані лесу на панскія патрэбы, або заплаціць за сажань па 6 злотых.

Ва ўладанні да 1783 г. засталіся тры фальваркі, якія апрацоўваліся наёмнымі работнікамі за адпаведную плату: за жніво і касьбу па 5 злотых за морг, за вымалат капы азімага збожжа – 1 злоты, капы яравога збожжа – 15 грошай. За гэтыя сродкі можна было наняць парабкаў і прышлых работнікаў, але ў фальварках працавалі мясцовыя сяляне – "чыншавая грамада"[69]. Нягледзячы на тое, што ў Шчорсах выкарыстоўвалася сістэма трохполля, ураджайнасць была вельмі высокай – сам-20, а ў лепшыя гады – сам-26[70].

Безумоўна, Іахім Храптовіч імкнуўся пераняць лепшы замежны вопыт арганізацыі вытворчасці ў сельскай гаспадарцы. З гэтай мэтай ён у 1769–1772 гг. наведаў Англію, Галандыю, Францыю, Аўстрыю[71]. Знаёмства з прагрэсіўнымі метадамі вядзення гаспадаркі спрыялі таму, што ў Шчорсах вялікая ўвага пачала надавацца не толькі земляробству, але і жывёлагадоўлі. На ўсіх дарогах, якія вялі ў вёску, былі пабудаваны старажавыя пасты, дзе неслі варту сяляне з мэтай не прапусціць ва ўладанне хворую жывёлу з іншых мясцовасцяў. Калі ішлі пагалоскі пра эпідэмію, то жывёла дзялілася на некалькі невялікіх стадаў і трымалася ў лесе пакуль не мінуе небяспека хваробы. Дэ Мехліг у 1783 г. падкрэсліваў, што за 20 гадоў кіравання Шчорсамі Іахімам Храптовічам у маёнтку не было ніводнага выпадку захворванняў цяглай і прадукцыйнай жывёлы, і гэта ў сваю чаргу спрыяла таму, што палі былі добра ўгноеныя і дагледжаныя.

Будучы сапраўдным прыхільнікам ідэй Асветніцтва, уладальнік сваім уласным коштам утрымліваў настаўніка, які вучыў сялянскіх дзяцей не толькі рэлігіі, але і грамаце. Храптовіч дбаў таксама і пра здароўе вяскоўцаў. У вёсцы быў "назаўсёды асаджаны цырульнік", які ў найбольш складаных выпадках, звязаных з захворваннем насельніцтва ўладання, быў абавязаны звяртацца за кансультацыяй да лекара ў Наваградк.

Такім чынам, правядзенне Храптовічам згаданых сацыяльна-эканамічных рэформаў значна пашырыла гаспадарчую самастойнасць падданых, абумовіла іх лепшы дабрабыт. Гэта спрыяла таму, што многія прыгонныя сяляне, якія ўцякалі ад жорсткага прыгнёту з межаў Расійскай імперыі, імкнуліся асесці менавіта ў маёнтках Іахіма Храптовіча[72].

Рэформы, якія праводзіў Павел Ксаверы Бжастоўскі, былі больш шырокія і радыкальныя, што дало падставы яго сучаснікам назваць спосаб

---

[69] Opisanie wybornego gospodarstwa w dobrach Szczorse do JW. Chreptowicza. – S. 534.
[70] Тамсама. – S. 539.
[71] Спірыдонаў, М. Храптовіч /М. Спірыдонаў //Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя. – У 2 т. – Т. 2. – Мінск: БелЭн, 2006. – С. 718–719.
[72] Рябинин, И.С. К вопросу о побегах русских крестьян в пределы Речи Посполитой: [По письмам Игнатия Омульского Иоахиму Хрептовичу] /И.С. Рябинин. – М., 1911.

арганізацыі жыцця ў гэтым уладанні "Паўлаўскай рэспублікай", а вядомасць пра яе нават перакрочыла межы Рэчы Паспалітай.

Уладанне Мерач (каля 140 валок, 1/3 частку якіх займала Мерачанская пушча) Павел Бжастоўскі набыў ад Корсакаў у 1767 г. у вельмі занядбаным стане. Як ён сам пісаў у 1811 г.: "Я ўбачыў зямлю, якая зарасла лесам... Па лясах трэба было шукаць горстку здзічэлых людзей, якія жылі ў галечы, абцяжараныя паншчынай, і ў стане нявольнікаў, як гэта было агульнапрынята ў тым краі"[73]. Ужо ў 1769 г. Павел Бжастоўскі выдаў Уставу, якая арганізавала жыццё ў маёнтку на падставе самакіравання[74], якая была пацверджана і дапоўнена ў 1791 г.[75].

У прадмове да Уставы 1769 г. Бжастоўскі патлумачыў яе асноўную мэту – "раз і назаўсёды" зрабіць так, каб падданыя мелі ўпэўненасць у сваіх дастатках, былі вызвалены ад баязні новых падаткаў, "жылі як людзі, паводле права"[76].

У адпаведнасці з ёй, сяляне былі падзелены на 4 катэгорыі – чыншавыя, баяры, цяглыя і кутнікі. Чыншавыя сяляне і баяры павінны былі насіць галаўныя ўборы рознага колеру, а таксама мець розную зброю для "аховы сваіх грунтаў". Першым тром катэгорыям сялян давалася зямля ў вечнае карыстанне з правам перадачы яе па спадчыне. Для цяглых сялян Устава прадугледжвала магчымасць перайсці ў стан чыншавікоў, для гэтага трэба было імкнуцца зрабіць сваю гаспадарку заможнай, трымаць валоку зямлі і мець не менш за 4 валоў і 6 кароў[77].

Вясковае насельніцтва таксама было вызвалена ад прыгоннай залежнасці і атрымала права пакінуць маёнтак пры ўмове выплаты даўгоў і выстаўлення пасля сябе замены. Разам з тым, Устава 1791 г. прадугледжвала мажлівасць выйсці з уладання і без выстаўлення замены, але пры гэтым неабходна было выплаціць уласніку 200 злотых, адрамантаваць хату, і пакінуць збожжа на засеў[78]. Згодна з падлікамі польскага даследчыка Юліана Бартыся, у другой палове 80-х г. XVIII ст. даход сялянскіх гаспадарак ў Паўлаве вагаўся ў памеры 1800–3000 злотых. Такім чынам, плата за свабодны выхад з уладання складала ўсяго ад 7 да 11 % ад агульнага даходу гаспадарак[79].

Устава 1769 г. зафіксавала 52 павіннасці сялян. Гэты пералік уключаў не толькі віды і памер феадальнай рэнты і дадатковыя павіннасці на карысць

---

[73] Цытуецца па: Geremek, R. Raj dla chłopów, czyli Rzeczpospolita Pawłowska http://www.newsweek.pl/artykuly/raj-dla-chlopow, дата доступу 2010-07-12.
[74] Pawła Ksawerego Brzostowskiego Ustawy dla majętności Pawłowa, czyli Merecza pod Wilnem // Próby reform włościanskich w Polsce XVIII wieku: Wybór źródeł. – S. 245–260. Падрабязна пра сістэму самакіравання ў Паўлаве гл.: Голубеў, В.Ф. Сельская абшчына ў Беларусі XVI–XVIII стст. /В.Ф. Голубеў. – Мінск: Беларус. навука, 2008. – С. 239–240.
[75] Pawła Ksawerego Brzostowskiego przyznanie dokumentu umowego, czyli Ustawy dla włości Pawłowskiej // Próby reform włościanskich w Polsce XVIII wieku: Wybór źródeł. – S. 260–269.
[76] Pawła Ksawerego Brzostowskiego Ustawy dla majętności Pawłowa, czyli Merecza pod Wilnem. – S. 246.
[77] Тамсама. – S. 255.
[78] Pawła Ksawerego Brzostowskiego przyznanie dokumentu umowego, czyli Ustawy dla włości Pawłowskiej. – S. 267–268.
[79] Bartyś, J. Rzeczpospolita Pawłowska na tle reform włościańskich w Polsce w XVIII wieku / J. Bartyś. – Warszawa, 1982.

двара, але фактычна рэгламентаваў многія элементы паўсядзённага жыцця паўлаўцаў. Так, напрыклад, першая павіннасць заключалася ў тым, каб жыхары Паўлава былі “сапраўднымі каталікамі”; другая – каб перад пачаткам і пасля заканчэння паншчыны разам уголас сяляне гаварылі тры малітвы і 10 запаведзей Гасподніх; сёмая павіннасць забараняла сялянам браць пазыкі на вяселле і хрысціны, каб гэта не прыводзіла да збяднення гаспадарак; дзясятая – не дапускала ўсялякія сваркі паміж суседзямі і здачу сялянскіх земляў у наём іншым людзям; тым, хто будаваў новыя хаты, дванаццатая павіннасць прадпісвала абавязковую наяўнасць комінаў і квадратных зашклёных вокнаў памерам у локаць; пятнаццатая павіннасць указвала сялянам на неабходнасць добрага вядзення гаспадарства і прадугледжвала лепшым гаспадарам узнагароду ў выглядзе шапкі з чырвоным верхам, якую іншыя асобы насіць не мелі права; сорак трэцяя павіннасць абавязвала сялян трымаць у чысціні свае дамы, двор і вуліцу і г.д.

Вялікае значэнне Павел Бжастоўскі надаваў адукацыі сваіх сялян. У 1770 г. ён стварыў у Паўлаве першую ў Рэчы Паспалітай сельскагаспадарчую школу для сялян і спецыяльна для навучання ў ёй у тым жа годзе выдаў у Вільні невялікую кніжку пад назвай “Пра земляробства для выгоднасці гаспадароў, якія жывуць у Паўлаве”[80]. У ёй тлумачылася, што земляробства – гэта навука і яе трэба ведаць, а менавіта, ведаць якасць сваіх грунтаў, хваробы раслінаў і жывёлы, своечасова пачынаць сельскагаспадарчыя работы і г.д. Гэтае выданне фактычна перадавала кароткі змест французскай кнігі “Справа пра земляробства”, якая была перакладзена самім Паўлам Бжастоўскім і выдадзена ў двух тамах у Вільні на працягу 1770–1773 гг.[81].

Такім чынам, можна пагадзіцца з думкай Ю. Бартыся пра тое, што Павел Бжастоўскі сваімі рэформамі стварыў у Паўлаве свайго роду мінідзяржаву ў дзяржаве са сваім урадам, судом, канстытуцыяй (Уставамі), нават фінансамі. Але пры гэтым варта задаць пытанне – а ці была на самой справе свабода ў паўлаўскіх сялян, якая была гарантавана ім уставамі, калі само паўсядзённае жыццё ў Паўлаве ў вялікай ступені было дакладна рэгламентавана і яго непарушнасць з 1791 г. ахоўвалася зямянскай міліцыяй? Яна была спецыяльна створана з ліку кіраўнікоў сялянскіх гаспадарак, якія кожную нядзелю ў 15 гадзін павінны былі прыходзіць у двор з карабінамі на салдацкія трэніроўкі[82]. Мажліва, у складаны для Рэчы Паспалітай час уладальнік маёнтка меў на мэце арганізаваць узброены сялянскі атрад, бо, як тлумачыў сам Бжастоўскі, задача зямянскай міліцыі заключалася ў тым, каб “ахоўваць свае грунты і граніцы і быць карыснымі не толькі для двара, **але і ў выпадку неабходнасці – для ўсёй дзяржавы”** (выдзелена намі – І.К.)[83]. Так, вядома, што паўлаўская міліцыя прымала актыўны ўдзел у барацьбе з расійскай арміяй у шэрагах войска Якуба Ясінскага падчас паўстання 1794 г.

---

[80] O rolnictwie dla wygody gospodarzow w Pawłowie mieszkaiących. – Wilno, 1770. – 80 s.
[81] Dzieło o rolnictwie. – T. I–II. – Wilno, 1770–1773.
[82] Pawła Ksawerego Brzostowskiego przyznanie dokumentu umowego, czyli Ustawy dla włości Pawłowskiej. – S. 265.
[83] Pawła Ksawerego Brzostowskiego przyznanie dokumentu umowego, czyli Ustawy dla włości Pawłowskiej. – S. 265.

Разам з тым, беларускі гісторык Валянцін Голубеў звярнуў увагу, што ў адносінах да рэформ Паўла Бжастоўскага можна прымяніць назву "вотчынна-паліцэйскі рэжым", якую расійскі гісторык В.А. Аляксандраў даў падобным памкненням памешчыкаў на тэрыторыі Расіі паставіць пад поўны кантроль жыццё падданых у сваіх уладаннях[84].

З другога боку, ці быў іншы спосаб у Бжастоўскага, прыхільніка тэорыі фізіякратаў, асветніка і мецэната, ажыццявіць прагрэсіўныя новаўвядзенні ў асяроддзі самай кансерватыўнай часткі тагачаснага грамадства – сялянства, акрамя як праз Уставы рэгламентаваць для іх абавязак вучыцца добра весці гаспадарку, трымаць у чысціні свае сядзібы, высажваць пладовыя дрэвы, забараніць п'янства, ліхвярства, сваркі паміж суседзямі і інш.? Такім чынам, нягледзячы на тое, што паўлаўскія мерапрыемствы Паўла Бжастоўскага вывучаліся як яго сучаснікамі, так і нашчадкамі, яны і сёння не страцілі актуальнасці для даследчыкаў. Для больш поўнага асэнсавання іх ролі і значэння ў агульным шэрагу рэформ другой паловы XVIII ст. у Рэчы Паспалітай неабходна грунтоўна даследаваць тагачаснае штодзённае жыццё ў Паўлаве, па магчымасці вызначыць прамыя сведчанні сялян адносна згаданых сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў.

Ва ўсялякім выпадку, Павел Бжастоўскі быў першым у дзяржаве, хто прыступіў да ажыццяўлення на практыцы асноўных палажэнняў тэорыі фізіякратаў у сваіх уладаннях. Паказальна, што ў якасці ініцыятараў рэформ, фундатараў, а часам і аўтараў перакладаў эканамічных выданняў у другой палове XVIII ст. у ВКЛ выступалі прадстаўнікі каталіцкай царквы, сярод якіх акрамя Паўла Ксаверыя Бжастоўскага былі віленскі біскуп Ігнацый Якуб Масальскі, ксёндз і матэматык Рыгор Князевіч, ксёндз Пётр Світкоўскі і інш.

Так, напрыклад, біскуп Ігнацый Масальскі, разумеючы, што адной з галоўных перашкодаў на шляху развіцця гаспадаркі былі недасканалыя прылады працы, купляў у Англіі розныя прылады і прыстасаванні для працы на зямлі, якія можна было прымяніць і пры апрацоўцы глебы ў ВКЛ, для таго, каб яны "былі ўзорам для вырабу такіх прыладаў у краіне"[85]. Акрамя таго, ён нават абвясціў конкурс і абяцаў узнагароду таму, хто прапануе "найлепшы спосаб гаспадарчай адукацыі сялян"[86], ад працы якіх у многім залежаў стан сельскай гаспадаркі.

Асветніцкая дзейнасць біскупа Масальскага, прынамсі першага старшыні Адукацыйнай камісіі (1773–1780), знайшла практычнае прымяненне ў шэрагу яго ўладанняў. Найбольш яскрава гэта можна прасачыць на прыкладзе маёнтка Убарць (Лельчыцы) Мазырскага павета, які з'яўляўся сталовым уладаннем віленскага біскупа. У інвентары за 1776 г. змешчана Генеральная ўстава Убарцкай воласці, у якой утрымліваюцца наступныя словы: "Я хацеў бы, каб людзі, якія па волі Бога знаходзяцца пад маёй уладай, былі найшчаслівейшымі, але таго не можа быць без асветы,

---

[84] Голубеў, В.Ф. Сельская абшчына ў Беларусі XVI–XVIII стст. – С. 240.
[85] Kalendarz Rolniczy i Gospodarski przez P. Bradley napisany przez X. Grzegorza Kniażewicza na polski ięzyk przełożony. – Wilno, 1770. – S. 17.
[86] Folwark w którym Grunta nie zostawują się nigdy ugorem. – S. 159.

таму абавязваю дваровую адміністрацыю дабівацца таго, каб усе гаспадары праз любоў да свайго патомства аддавалі дзяцей зімоваю парою ў парафіяльныя школы вучыцца адпаведным для свайго саслоўя навукам, каб лепш разумелі мае погляды і бацькоўскую апеку, жаданне павялічыць для кожнага магчымасці, даваемыя лёсам, атрымаць пэўную свабоду...”[87]. Гэтыя ж словы былі ўнесены і ва Уставу Убарці за 1780 г.[88], у якой таксама было зафіксавана, што “ўласнасць кожнага жыхара забяспечана на вечныя часы такім чынам, што яны свабодныя распараджацца зямлёй, хатамі, усялякай рухомасцю і прадаваць паводле свайго жадання, а двор ні пад якай прычынай не павінен у гэта ўмешвацца”[89]. Сяляне выплочвалі чынш і мядовую даніну, а згодна з іншымі палажэннямі Уставы 1780 г., ім таксама забяспечваліся: свабода гандлю, адукацыя дзяцей, абшчыннае самакіраванне, грашовая аплата за розныя віды працы на патрэбы двара і інш.[90]. Прыкладна такія ж мерапрыемствы былі праведзены Масальскім і ў Ігуменскай воласці, якая таксама належала Віленскаму біскупству[91].

Падводзячы вынікі, неабходна адзначыць, што мерапрыемствы, якія праводзілі вышэйпералічаныя асобы, былі шырока вядомыя ў Рэчы Паспалітай і пры гэтым выклікалі розную рэакцыю сярод прадстаўнікоў шляхецкага саслоўя. Адныя падтрымлівалі іх, пераймалі вопыт, друкавалі артыкулы ў перыядычным друку, пісалі вершы. Другія – лічылі іх здрайцамі шляхецкага і асабліва духоўнага стану, як гэта было ў выпадку з Ігнацыем Масальскім і Паўлам Бжастоўскім. Прыхільнікі “старыны” – традыцыі, якая стагоддзямі панавала ў грамадстве, былі перакананы, што яны жывуць у самай справядлівай дзяржаве – шляхецкай рэспубліцы – і любыя змены з’яўляюцца недапушчальнымі. Хатняя адукацыя, якую атрымлівала пераважная большасць шляхты, не магла даць сістэматычных ведаў, пашырыць кругагляд і спрыяць пэўнай “мадэрнізацыі” ў іх розумах, для якой у другой палове XVIII ст. важнае значэнне меў асветніцкі спосаб разумення прагрэсу як аддзялення (ці супрацьпастаўлення) сучаснасці і мінулага[92]. Таму ў большасці сваёй шляхта адмоўна ставілася да рэформ і ўвядзення новых элементаў у пануючую грамадска-палітычную і гаспадарчую сістэму. Гэтую варожасць Станіслаў Ляшчынскі характарызаваў наступнымі словамі: “Шляхціц не быў бы шляхціцам, калі б плябей не быў рабом”[93].

Разам з тым, для эфектыўнай арганізацыі гаспадаркі найбольш адукаваная частка грамадства шукала розныя эканамічныя метады кіравання сваімі ўладаннямі, сярод якіх галоўнымі ў эпоху Асветніцтва былі ачыншаванне сялян і прадстаўленне ім пэўнай эканамічнай і асабістай

[87] Цытуецца па: Голубеў, В.Ф. Сельская абшчына ў Беларусі XVI–XVIII стст. – С. 282.
[88] Рукапісны аддзел бібліятэкі Віленскага універсітэта. – F. 57 – Б53 – 137. – Арк. 25 адв.
[89] Тамсама.
[90] Тамсама. – Арк. 25 адв. – 27 адв.
[91] Голубеў, В.Ф. Сельская абшчына ў Беларусі XVI–XVIII стст. – С. 284–285.
[92] Gawlas Sl. Polska Kazimerza Wielkiego a inne monarchie Europy Środkowej – możliwości i granice modernizacji władzy // Modernizacja struktur władzy w warunkach opóznienia: Europa Środkowa i Wschodnia na przełomie średniowiecza i czasów nowożytnych. – Warszawa, 1999. – S. 7.
[93] Цытуецца па: Z dziejów polskiej myśli filozoficznej i społecznej. – T. II: Wiek XVIII: Oświecenie. – S. 11.

свабоды. Тым больш, што да пачатку 1780-х г. стала відавочна, што стаўка Антонія Тызенгаўза на ўжыванне адміністрацыйнага рэсурсу пры правядзенні гаспадарчых пераўтварэнняў ў каралеўскіх сталовых эканоміях ВКЛ не прынесла плёну. Крытычнай кропкі гаспадарчае становішча ў сталовых эканоміях дасягнула да 1780 г. Так, у Гарадзенскай эканоміі, якая з'яўлялася цэнтрам эканамічных і культурных пераўтварэнняў А. Тызенгаўза, з 1765 г. па 1780 г. колькасць насельніцтва зменшылася прыкладна на 8 %. Разам з тым, нічога не вядома пра якія-небудзь эпідэміі ці іншыя здарэнні такога кшталту на тэрыторыі Гарадзеншчыны ў гэты час. Напрыклад, у дакуменце аб стане Скідзельскага ключа гэтай эканоміі за 1777 г. насупраць значнай колькасці сялянскіх прозвішчаў адзначалася – "паншчыны эканамічнай не адпрацоўвае, пайшоў за хлебам"[94]. Сяляне збягалі з каралеўскіх уладанняў і наймаліся на працу ў прыватныя шляхецкія маёнткі, дзе падаткаабкладанне было адчувальна меншым. У выніку А. Тызенгаўз у 1780 г. быў адхілены ад усіх дзяржаўных пасадаў.

Далейшае развіццё гэтых відаў уладанняў паказвае, што адбылася пэўная пераарыентацыя дзяржаўнай палітыкі ў адносінах да іх. У 1780 г. было ліквідавана каля 25 дзён паншчыны ў год і розных дробных пабораў на суму ад 10 да 15 злотых з гаспадаркі, павялічылася колькасць чыншавых гаспадарак (за 4 гады на 5 %). Сялян сталовых эканомій пераводзілі на чынш цэлымі вёскамі і нават ключамі. Складзенае ў 1782 г. каралеўскім шамбелянам Томашам Адамам Урускім данясенне каралю наконт стану ў літоўскіх эканоміях сведчыць, што "зробленыя паслабленні і ільготы далі магчымасць амаль усім падданым лепш брацца за гаспадарства і садзейнічалі таму, што шмат збеглых вярнуліся назад"[95]. Да таго ж, Урускі заўважыў, што неабходна як мага хутчэй ліквідаваць фальваркі, якія знаходзяцца на значнай адлегласці і для апрацоўкі якіх падданыя павінны хадзіць некалькі міляў. Раздача такіх фальваркавых грунтаў на чынш, па яго меркаванню, "была б карыснай для скарбу і павялічыла б аседласць, а значыць і чынш, што не саступала б даходам з фальварку"[96].

У час існавання традыцыйнага, даіндустрыяльнага грамадства, калі змены ў аграрным сектары ў значнай ступені вызначалі агульны стан эканамічнага жыцця, рашаючы ўплыў на гаспадарчае развіццё мела палітыка ўлады ў адносінах да сялян і землеўладальнікаў, а таксама яе роля ў збіранні падаткаў і размеркаванні прывілеяў. Нягледзячы на тое, што адна з функцый дзяржаўных інстытутаў заключаецца ў тым, каб забяспечыць элементы стабільнасці і пераемнасці, без якіх грамадству пагражае дэзінтэграцыя, існуюць выпадкі, калі выкананне гэтай функцыі можа прыйсці ў супярэчнасць з патрабаваннямі эканамічнага развіцця, перашкаджаючы рацыянальнаму выкарыстанню рэсурсаў ці стрымліваючы інавацыйную

---

[94] AGAD, Archiwum Kameralne, III/166, арк. 13.
[95] AGAD, Archiwum Kameralne, III/68, арк. 5.
[96] AGAD, Archiwum Kameralne, III/69, арк. 454.

актыўнасць і распаўсюджванне тэхналогій[97], як гэта адбылося ў Рэчы Паспалітай у 60–70-я гг. XVIII ст. Змяненне ў 1780 г. накірунку скарбавай гаспадарчай палітыкі ў бок паслаблення падаткава-павіннаснага абкладання, змяншэння паншчыны ці нават поўнага вызвалення ад яе сялян каралеўскіх сталовых эканомій у ВКЛ і такім чынам прадстаўлення ім пэўнай эканамічнай свабоды з'явілася стымулам для развіцця іх гаспадарчай ініцыятывы і агульнага паляпшэння эканамічнай сітуацыі ў краіне.

Другая палова XVIII ст. у Рэчы Паспалітай была пачаткам тыповага пераходнага перыяду ад феадалізму да капіталістычнага ўкладу. Пануючая ў краіне фальваркава-паншчынная сістэма ўжо не магла забяспечыць адпаведнага ўзроўню развіцця, паколькі ўтрымлівала сялянскую гаспадарку на спажывецкім узроўні і рабіла немажлівым яе ператварэнне ў вытворчы арганізм. Верагодна ўпершыню традыцыя, якая на працягу стагоддзяў была бясспрэчным аўтарытэтам, у другой палове XVIII ст. стала падвяргацца крытыцы, і з уласцівым для тых часоў аптымізмам пачала даказвацца магчымасць рацыянальнага ўплыву на кшталтаванне будучага грамадства. Захаванне паншчыны прызнавалася неэфектыўным, больш за тое, тупіковым шляхам, які ў новых умовах развіцця не мог забяспечыць канкурэнтназдольнасць мясцовых сельскагаспадарчых тавараў на рынках Заходняй Еўропы. Ключавым момантам у дасягненні эфектыўнасці гаспадарчага развіцця лічылася эканамічная свабода, асабістая зацікаўленасць у выніках сваёй працы і абавязковая гаспадарчая адукацыя непасрэдных вытворцаў – сялян. Пастунова прыходзіла ўсведамленне, што ў першую чаргу неабходна імкнуцца не да павелічэння колькасці вясковага насельніцтва, а да павелічэння іх маёмасці, бо толькі багатыя сяляне – залог багацця краіны[98]. Менавіта ў гэты час упершыню пачало прыходзіць асэнсаванне таго, што эканоміка – гэта не "рэч у сабе", і гаспадарчая дзейнасць не можа аддзяляцца ад палітычных і грамадскіх поглядаў[99], а эканамічная магутнасць з'яўляецца асновай палітычнай і ваеннай бяспекі краіны[100].

---

[97] Камерон, Р. Краткая экономическая история мира. От палеолита до наших дней /Р. Камерон /Пер. с англ. – М.: РОССПЭН, 2001. – С. 22.
[98] Pamiętnik Historyczno-Polityczny. – Warszawa, 1788. – T. I. – S. 30.
[99] Бродель, Ф. Время мира: В 3 т. – Т. 3: Материальная цивилизация, экономика и капитализм, XV–XVIII вв. – М.: Прогресс, 1992. – С. 9.
[100] Pamiętnik Historyczno-Polityczny. – Warszawa, 1787. – T. III. – S. 626.